*Аляксандр Макарчык*

# Інтрыга вакол 10 тысяч дукатаў

Самай вялікай загадкай Мірскага замка, безумоўна, з'яўляецца яго ўзнікненне. Амаль усе даследчыкі гісторыі Мірскага замка пастаянна ставяць пытанне, што прымусіла далёка не самага багатага і не самага ўплывовага ўрадніка Вялікага княства Літоўскага ўзяцца за маштабнае будаўніцтва. Інтрыгуе і той факт, што Ільініч распачаў грандыёзнае будаўніцтва на схіле свайго жыцця.

Адказ на гэту загадку шукаў першы гістарыёграф замка, пісьменнік Уладзіслаў Сыракомля. "Татарскія спусташэнні, сваркі Забжазінскіх, Ільінічаў, Кішкаў, Глябовічаў і іншых літоўскіх магнатаў з гордым і магутным Міхаілам Глінскім, сваркі, якія прывялі да таго, што Забжазінскі быў пазбаўлены ваяводскай пасады, а Крыштоф Ільініч трапіў у турму, і яшчэ жахлівы лёс Яна Забжэзінскага, на якога Глінскі ўчыніў напад, замардаваў ва ўласным доме, – усё гэта, відаць, і натхніла Юрыя Ільініча пабудаваць у Міры крэпасць" [16, с. 198–199]. Пазнейшыя даследчыкі, за выключэннем некаторых нюансаў, у асноўным прытрымліваюцца гэтай трактоўкі.

Даследчык гісторыі замка Валянцін Калнін звязвае пачатак будаўніцтва Мірскага замка з атрымання вялікага крэдыту ад фінансіста Абрама Езафавіча. Ён піша: "З найбольшай верагоднасцю будаўніцтва Мірскага замка пачалося адразу пасля выйгранай справы па Свержанскіх ловах. Пацвярджэннем таму з'яўляюцца вядомыя з пісьмовых крыніц звесткі пра атрыманне Ільінічам значнага крэдыту акурат пасля 1522 г." [7, с. 35]. Судовая цяжба Юрыя Ільініча з Храбтовічамі і Остыкамі за Мірскія ўладанні падрабязна разгледжана ў гістарычнай даведцы В.В. Калніным, дзе ёй прысвечана спе-

цыяльная глава “Аспрэчванне правоў на Мірскія ўладанні (1495–1522) [6, с. 17–25].

Яго сцвярджэнне аб пачатку будаўніцтва замка не выклікае сумненняў. Але вось гісторыя з атрыманнем вялікіх грошай ад Абрама Езафавіча аказалася даволі заблытанай і нават інтрыгуючай. У канчатковым выпадку гэтых грошай Юрый Іванавіч Ільініч не атрымаў. На гісторыі з грашыма Абрама Езафавіча неабходна спыніцца больш падрабязна. Яна дасць магчымасць удакладніць важнае пытанне аб крыніцах фінансавання будаўніцтва Мірскага замка і, між іншым, раскрые цікавую старонку ўзаемаадносін людзей 20-х гг. XVI ст.

Жыццёвыя шляхі Юрыя Іванавіча Ільініча часта перакрыжоўваліся з Абрамам Езафовічам Рэбічковічам. У Абрама ўжо было прозвішча Рэбічковіч, але ў сувязі з тым, што ў пач. XVI ст. прозвішчы яшчэ шырока не ўжываліся, у гістарычных дакументах ён вядомы пад прозвішчам па бацьку – Езафавіч. Пад прозвішчам па бацьку Абрам і ўвайшоў амаль ва ўсе даведнікі. Гісторыя жыцця гэтага чалавека, як і яго брата, даволі займальная. “С вошествием на престол Сигизмунда I главными и почти единствеными откупщиками становятся члены еврейской семьи Ребиновичай (Рэбічковічаў – аўтар) из Бреста” [1, с. 398]. Старэйшы з братоў, Абрам Рэбічковіч, нават атрымаў пасаду земскага падскарбія, гэта значыць, экстрапалюючы на наш час, пасаду міністра фінансаў краіны. Пасля яго смерці засталася вялікая спадчына. За яе, а канкрэтна за 10 тыс. дукатаў, разгарнулася сапраўдная барацьба.

Абрам Езафавіч, нягледзячы на простае паходжанне, дасягнуў высокай пасады і сабраў за жыццё даволі вялікае багацце. Напрыканцы свайго жыццёвага шляху, у 1519 г., Абрам Езафавіч прыехаў у Бярэсце, дзе ў гэты час праходзіў вальны сойм, і ў прысутнасці вялікага князя Жыгімонта Ста-

рога прадыктаваў тэстамент. Гэты тэстамент быў зацверджаны пячаткай Вялікага князя. У дарозе, вяртаючыся з Бярэсця, Абрам Езафавіч памёр. З тэксту тэстамента стала вядома, што ў яго засталіся два сыны Васіль і Канстанцін, дачка Марыя, жонка Ганна Васільеўна, якім Абрам завяшчаў сваё багацце. Ільвіная частка яго неверагоднага па тым часе багацця, а канкрэтна 10 тыс. дукатаў (не наяўнымі грашыма, але па дакументах), а таксама двор з домам у Вільні і некалькі маёнткаў пераходзіла старэйшаму сыну Васілю. Але справа ў тым, што нават старэйшы сын Абрама быў непаўналетнім (у гэты час яму было толькі 11 гадоў). Тым не меней, бацька паспеў заручыць Васіля з дачкой Юрыя Іванавіча Ільініча – Ядвігай. І вось да дасягнення паўналецця Васіля яго апекуном, згодна тэстаменту, назначаецца Юрый Іванавіч Ільініч: "…змовил если вельможнаго пана Юря Ивановича, Маршалка Дворнаго, старосты Берестейскаго и Лидскаго дочку его милости, паньу Ядвигу, за сына моего Василя: и естьли надо мной Божья воля станет, тогды жо я поручаю у вас опеку пану Юрю, его милости, сына моего Василя со всим с тым, што есьмо ему отписал в сем моем тостаменте, именьи и готовизною. Тым всим с сыном моим мает пан Юри, его милость, печаловати до тых часов, поки он лет своих доростет и дочку его милости за себя поймет" [13, с. 97].

Службовай кар'еры Абрама Езафавіча спрыялі яго выдатныя асабістыя якасці, асабліва дасведчанасць у фінансавых пытаннях. Пакінуўшы ў 1485 г. Кіеў, Абрам Езафавіч пасяліўся ў Вільні, але часта бываў у Бярэсці, дзе жыў бацька Юрыя Іванавіча Ільініча, які там і памёр у 1496 г. [22, p. 149]. З 1510 г. Юрый Ільініч быў старастам у Бярэсці. Асабліва цесна супрацоўнічалі Юрый Іванавіч Ільініч і Абрам Езафавіч у Коўне. У некаторых дакументах Абрама Езафавіча нават называюць ковенскім старастам [12, с. 88–90; 308; 484].

Абрам Езафавіч быў арандатарам мытняў горада Коўна (цяпер г. Каўнас). Права на арэнду ковенскіх мытняў ён атрымаў наступным чынам: Абрам Езафавіч пазычыў вялікаму князю ВКЛ Жыгімонту Старому 10 тыс. дукатаў у наяўнай манеце. Пазыка давалася пад адсоткі. Але выплаты па адсотках Вялікі князь не рабіў, а ўзамен адсоткаў Абрам Езафавіч забіраў сабе плацяжы з гарадскіх мытняў Коўна. Як адзначае М.К. Любаўскі: "…в даном случае оказала свое влияние практика государственной жизни Польши, где этот способ удовлетворения финансовым нуждам государства практиковался в широких размерах в XV в." [10, с. 13]. Калі Вялікі князь вяртаў пазыку, ў даным выпадку 10 тыс. дукатаў, тэрмін заставы завяршаўся.

Пасля 1519 г., калі не стала Абрама Езафавіча, прыбыткі з Коўна браў сабе Юрый Іванавіч Ільініч, паколькі згодна тэстаменту быў апекуном непаўналетняга Васіля. У нас няма дакументальнага пацвярджэння гэтаму, але на карысць таго, што прыбыткі з ковенскіх мытняў забіраў сабе Юрый Ільініч, ускосна сведчыць заканадаўства тых часоў. У прынятым некалькі пазней Статуце 1529 г. гаворыцца: "...за свою працу, што-колве прийдеть с пашен, з млынов и присудов, то мають собе опекательники на свои пожитки оборочати…" [15, с. 64].

Як адзначалася вышэй, непаўналетні Васіль быў спадкаемцам 10 тыс. дукатаў. Вакол гэтых грошай у 1523 г. пачалася інтрыга. Пра гэту гісторыю да нас дайшлі звесткі ў ліставанні Жыгімонта Старога. Былі тры лісты, копіі якіх запісаны ў Літоўскай Метрыцы. Тэкст двух лістоў апублікаваны, тэкст трэцяга – у дадатку [9, с. 71–72; 76–77]. С.А. Бяршадскі (1850–1896), аўтарытэтны знаўца гісторыі габрэяў у Вялікім княстве Літоўскім, першым з навукоўцаў звярнуў увагу на гэтую гісторыю [2, с. 148–151]. Але некаторыя яго сцвярджэнні патрабуюць удакладнення.

Каласальныя па тым часе прыбыткі, якія прыносіла валоданне горадам Коўна, не давалі многім спакою. У 1522 г. на Коўна паквапіўся самы багаты пан тых часоў – Януш Станкавіч Касцевіч. Яго бацька ў свой час быў старастам горада Коўна, і, магчыма, гэты горад быў для яго родным. У 1522 г. пісар Жыгімонта Старога Павел Нарушэвіч у абход паноў-рады выдае ад імя Вялікага князя прывілей на стараства ковенскае Янушу Касцевічу, чым груба парушае тагачасную практыку. Вядома, гэта выклікала рэзкі пратэст, у першую чаргу, канцлера Альбрэхта Марцінавіча Гаштольда [24, s. 343]. Выдача вялікакняскіх прывілеяў была прэрагатывай канцылярыі Вялікага княства, на чале якой стаяў Альбрэхт Гаштольд. Але, галоўнае, гэта парушала правы паноў-рады, без згоды якіх вялікі князь не меў права, згодна прывілея Аляксандра Ягелончыка, прызначаць на дзяржаўныя пасады, тым болей на такія важныя.

Для Юрыя Іванавіча Ільініча сітуацыя 1522 г. дакладна нагадвала сітуацыю 1504 г., калі Міхаіл Глінскі, карыстаючыся сяброўствам з вялікім князем Аляксандрам Ягелончыкам, таксама ў абход паноў-рады дабіўся прызначэння старастам Лідскім свайго сваяка Андрэя Дразда [4, с. 510]. Гэтая падзея выклікала вялікі рэзананс і нават трапіла на старонкі “Хронікі Быхаўца” [18, с. 154]. Пасля падаўлення ўзброенага выступлення пад кіраўніцтвам Міхаіла Глінскага Юрый Іванавіч вярнуў сабе пасаду Лідскага старасты.

Каб “падсаладзіць пілюлю”, на гарадзенскім сойме 1522 г. Жыгімонт Стары выдае прывілей Юрыю Іванавічу на пажыццёвае валоданне Берасцейскім і Лідскім староствамі. Маўляў, гэтых пасад у яго не адбяруць [11, с. 64].

Але на гэтым праблемы з Коўнам не скончыліся. Януш Станкавіч Касцевіч вырашыў канчаткова выціснуць Юрыя Іванавіча Ільініча з Коўна. Гэта адбывалася такім чынам.

Да 1523 г. вялікі князь Жыгімонт Стары назапазычваў вялікую суму грошай ў падляшскага ваяводы Януша Касцевіча. Напрыклад, у 4-й кнізе судовых справаў гаворыцца толькі пра адну пазыку ў 3446 коп [9, с. 72]. Былі і іншыя пазыкі, вярнуць якія адразу Жыгімонт Стары не мог, таму даў загад земскаму падскарб'ему выдаць Янушу Касцевічу толькі 2000 коп. грошай з сярэбшчыны (падатак на ваенныя патрэбы). Напэўна, вялікі князь даволі доўга не вяртаў пазыку, калі выдаваліся сярэбшчынныя грошы, паколькі сярэбшчына збіралася на выпадак вайны. Але гэтых грошай было недастаткова, каб разлічыцца з Янушам Станкавічам Касцевічам. Таму Жыгімонт Стары вырашыў перадаць яму правы на арэнду ковенскіх мытняў, якія фармальна ўсё яшчэ лічыліся за нябожчыкам Абрамам Езафавічам, але даходы з якой, хутчэй за ўсё, забіраў сабе Юрый Іванавіч Ільініч. Жыгімонт аргументуе сваё рашэнне наступным чынам: "...бо вжо досыть станет привилю нашому, который небожчик Аврам на Ковен мел" [9, с. 72]. Гэта быў балючы ўдар як па прэстыжу Юрыя Іванавіча Ільініча, так і па яго кішэні. Безумоўна, ён хацеў і надалей трымаць ковенскія мытні ў арэндзе як апякун Васіля Абрамавіча і ўсе прыбыткі з іх забіраць сабе ў якасці адсоткаў за пазыку вялікаму князю.

Не трэба забываць, якім быў горад Коўна ў XVI ст. Гэта былі паўночна-заходнія вароты краіны. Праз Коўна ішоў увесь гандаль з Круляўцом (цяпер г. Калінінград) і большая частка гандлю з іншымі краінамі Поўночнай і Сярэдняй Еўропы. Галоўнай транспартнай артэрыяй Вялікага княства Літоўскага быў Нёман, на якім і знаходзіўся Коўна. Менавіта на ковенскай мытні афармляліся экспартныя тавары. З гэтага вынікае, што Януш Касцевіч пазычыў вялікаму князю 10 тыс. дукатаў, каб карыстацца вельмі прыбытковым месцам.

Каб пазбавіць правоў на арэнду ковенскай мытні, якая

ўсё яшчэ фармальна лічылася за нябожчыкам Абрамам Езафавічам, Жыгімонт Стары павінен быў вярнуць яго сыну Васілю пазыку ў памеры 10 тыс. дукатаў. Таму якраз за 10 тыс. дукатаў, або за копы грошай, эквівалентных 10 тыс. дукатаў, вялікі князь і перадае арэнду ковенскімі мытнямі падляшскаму ваяводзе Янушу Касцевічу. Януш Касцевіч згадзіўся заплаціць за гэту арэнду наяўнымі "десять тисечей золотых угорскихъ черленых", г.з. дукатаў венгерскага біцця [9, с. 77]. Паколькі Жыгімонт Стары лічыў Васіля яшчэ непаўналетнім, то даў загад Янушу Касцевічу 10 тыс. дукатаў у наяўнай манеце палажыць у куфэрак і аддаць на захаванне ў сакрысцію касцёла Святога Станіслава ў Вільні. У сваім лісце Жыгімонт Стары просіць віленскага біскупа Яна прыняць гэтыя дукаты і разам з віленскім ваяводай Альбрэхтам Гаштольдам ды надворным маршалкам Юрыем Іванавічам Ільнічам як акзэкутарамі (душапрыказчыкамі) Абрама Езафавіча апячатаць усю гэтую суму. Можна ваказаць меркаванне, што грошы захоўваліся ў куфэрку (ці як тады называлі – скрынцы). Так, напрыклад, троцкі ваявода Ян Янавіч Глябовіч паведамляе, што пры пажары ў палацы Вязовец у яго згарэла "скрынка" з вельмі каштоўнымі граматамі [14, с.71]. Януш Касцевіч мог прыступіць да арэнды ковенскай мытні толькі пасля таго, як пакладзе азначаную суму ў сакрысцію касцёла Святога Станіслава. Жыгімонт Стары адзначыў, каб гэтыя грошы, як расплата за пазыку Абрама Езафавіча, захоўваліся ў сакрысціі касцёла да дасягнення Васілём паўналецця.

Падобны расклад не падабаўся Юрыю Ільнічу. Ён нават адмовіўся паставіць сваю пячатку на куфэрку з дукатамі: "Пак лиж бы пан Илинич сам там быти и печать свою к той суме приложити не хотел…". [9, с. 72]. Мажліва, Юрый Ільніч меркаваў, што гэтыя 10 тыс. дукатаў, якія Януш Касцевіч аддаваў на захаванне, павінны былі дастацца Васілю адразу.

Таму пасля гэтага Юрый Ільініч звяртаецца да вялікага князя і нагадвае аб тым, што Васіль ужо паўналетні, стаў яго зяцем, і жонка Васіля – Ядвіга – таксама паўналетняя. Выклаўшы такія довады, Юрый Ільініч нават адправіў асабіста Васіля Абрамавіча да Жыгімонта Старога. Упамінанне пра жонку, дачку Юрыя Ільініча, выкарыстоўвалася для таго, каб узмацніць свае правы на гэтыя грошы.

Мусіць, довады Юрыя Іванавіча Ільініча паказаліся слушнымі Жыгімонту Старому, бо ён адразу накіроўвае ліст да ваяводы віленскага Альбрэхта Гаштольда, у якім радзіць выдаць тыя грошы самому Юрыю Іванавічу: "Ино коли сын Аврамов лета свои мает, и, твоя бы милость, тую десять тисечей золотых угорских черленых на руки пану Юрю Иличу дал" [9, с. 77]. Затым у лісце Альбрэхту Гаштольду ідзе патрабаванне ўзяць распіску ў Юрыя Іванавіча: "…а тым бы обычаем: твоя милость, рачыл в пана Юря Илинича взятии запис под его печатью и тэж под сведомом и под печатьми некоторых панов рад наших, как будете на сойме, а естли бы дочка пана Юрева Илинича, которая бы мяла быти за Аврамового сына, вмерла, або бы, того, боже, не дай, естли бы на самого пана Юря Илинича бог смерть допустил, ажбы тую ж суму, десять тисечей золотых черленых жо зятю своему на именьях своих записал так достаточных, которые бы именья за тую десять тисячею череных золотых добре стояли, до тых часов, поки бы тую суму сам пан Юри або сыны его сыну Аврамову отдали, або пан Юря за тую за всю суму именья ему паступить с пожитком зятя сваего. А тот бы, твоя милость, запис узял у пана Юря Илинича на нашое имя, и на твоей милости так, как на эззекуторов прыслушить" [9, с. 77]. Дакумент сведчыць, што Юрый Іванавіч Ільініч быў абмежаваны ў выкарыстанні гэтых 10 тыс. дукатаў, і што маглі наступіць абставіны, пры якіх ён мог пазбавіцца ўсёй гэтай сумы.

Хацелася б спыніцца на яшчэ адной неардынарнай асобе, якая аказалася ўцягнутай у гэту гісторыю – віленскім біскупе Яне (1496–1538). (Ілл.1) Менавіта ён павінен быў прыняць на захаванне вышэйзгаданыя грошы. Біскуп Ян быў пазашлюбны сын вялікага князя Жыгімонта Старога. Ён нарадзіўся ў Кракаве ў 1496 г. і ў 1519 заняў вельмі важную пасаду віленскага біскупа [23, с. 439]. На пасяджэннях паноў-рады віленскі біскуп садзіўся першы. Будучы маладым і энергічным біскупам, ён з вялікім энтузіязмам узяўся за навядзенне парадку, што многім не падабалася. Той факт, што ён быў пазашлюбным сынам, выклікаў злыя жарты і нават сарказм. Нянавісць некаторых магнатаў дайшла да таго, што аднойчы, у 1522 г., Станіслаў Радзівіл агаліў шаблю і кінуўся з ёю на біскупа Яна. Толькі дзякуючы дапамозе Пятра Кміты, небяспечная сітуацыя скончылася не трагічна: Радзівіл адсёк біскупу Яну толькі палец [23, с. 440].



*Ілл.1 Біскуп Ян 1449-1538*
*Kurczewski, Jan. Kościół zamkowy czyli katedra Wileńska. Wilno, 1910.*

Неўзабаве сітуацыя з 10 тыс. дукатамі становіцца незразумелай. У 1523 г. гэтых грошай Юрый Ільініч не атрымаў, што стала вядомым з трэцяга ліста Жыгімонта Старога. У лістападзе 1526 г. з Кракава выехаў каралеўскі ўпаўнаважаны Барыс Юравіч з лістом ад вялікага князя да ваяводы віленскага

Альбрэхта Гаштольда [27, с. 316]. У гэтым лісце адзначалася, што да яго, вялікага князя, звярнуўся Ян Абрамавіч з чалабітнай аб тым, каб яму нарэшце выдалі тыя 10 тыс. залатых. (Аказваецца, што Васіль памяняў сваё імя на Яна. Адбылося гэта, хутчэй за усё, раней, пад час шлюбу Васіля з Ядвігай. У тыя часы нельга было католікам браць шлюб з праваслаўнымі. Таму праваслаўны Васіль перахрысціўся і стаў католікам Янам). Аналіз тэксту трэцяга ліста вялікага князя праясняе далейшы лёс 10 тыс. дукатаў.

Становіцца вядомым, што гэтыя грошы знаходзіліся ўжо не ў сакрысціі касцёла Святога Станіслава, а ў гарадской ратушы. Больш таго, яшчэ раней віленскаму магістрату ўжо было накіравана папярэджанне, каб грошы з гэтага куфэрка выдаваліся толькі па асабістым распараджэнні вялікага князя.

Падобныя распараджэнні, як правіла, даваліся тады, калі ўжо адзначаліся спробы завалодаць грашыма.

У лісце вялікага князя гаварылася, каб Альбрэхт Гаштольд, нарэшце, у прысутнасці яшчэ якога-небудзь надзейнага сведкі выдаў грошы Яну Абрамавічу.

С.А. Бяршадскі так тлумачыць, чаму ў 1523 г. Юрый Іванавіч не атрымаў 10 тыс.: “Быть может Ю.И. Илинич нашёл неудобным для себя эти условия, на всего вероятнее, что известие о признании одного из наследников Авраама Езефовича совершеннолетним и о распоряжении выдаць на его руки огромную сумму наличными деньгами подняло на ноги всех далеко еще неудовлетворённых кредиторов Авраама Езефовича” [2, с. 150].

Падобнае сцвярджэнне малаверагоднае. Можна выказаць меркаванне, што Юрый Ільініч усё зрабіў, каб грошы, якія ўжо былі дэ-юра ў яго руках (у лісце вялікага князя канкрэтна даецца загад – выдаць Ільінічу), дасталіся яму.

Зразумела, чаму грошы аказаліся не ў сакрысціі касцёла, а ў гарадской ратушы. У 1523 г. біскуп Ян распачаў за свой кошт перабудову касцёла Святога Станіслава. Кіраваў перабудовай італьянец па прозвішчы Аннус. Перабудова адбывалася прыкладна два гады [20, s. 29]. Хутчэй за ўсё з-за гэтай прычыны грошы маглі быць перададзены ў гарадскую ратушу. Хаця прычына магла быць і ў тым, што сакрысція ў касцёле лічыцца святым месцам. Само слова "сакрысція" перакладаецца на нашу мову як святое месца. Калі пачалася барацьба за гэтыя грошы, то віленскі біскуп Ян і вырашыў перадаць "гарачы" куфэрак з грашыма ў ратушу. Магчыма, нават былі спробы адкрыць яго і ўзяць калі не ўсе грошы, то хаця б частку. Толькі гэтым можна патлумачыць прадпісанне вялікага князя войту горада Вільня, а таксама бурмістру і радцам нікому не даваць гэтыя грошы, але толькі па яго, вялікага князя, распарджэнню.

С.А. Бяршадскі адзначае: "На этот раз, надо полагать, Яну Аврамовичу удалось, наконец, получить завещанныя деньги, так как нам не удалось встретить о них дальнейших упоминаний" [2, с. 151].

Хочацца заўважыць, што Яну Абрамавічу тады было толькі 19 гадоў і наўрад ці ён быў поўнасцю самастойным у прыняцці важных пытанняў. Як адзначае І.М. Гарбачэўскі, "полнае совершеннолетие", т.е. права выконваць сур'ёзныя фінансавыя аперацыі, наступала толькі ў 24 гады [3, с. 21]. Ёсць яшчэ адзін нюанс. У к. 20-х – пач. 30-х гг. браты Рэбічковічы – Ян і Канстанцін – аказаліся ў вельмі цяжкім фінансавым становішчы і літаральна распрадавалі сваю нерухомасць. Нелагічна атрымліваецца, што, атрымаўшы такую суму грошай, можна было аказацца ў цяжкім становішчы.

Незразумелай застаецца і сітуацыя з адносінамі да грошай віленскага ваяводы Альбрэхта Гаштольда. Наогул, узнікае думка, што, набіраючы моц, Альбрэхт Гаштольд быў галоўнай перашкодай для атрымання гэтых грошай Юрыем Іванавічам Ільінічам. У другой палове 20-х гг. XVI ст. у процілегласць узмацненню ўлады Альбрэхта Гаштольда аслабляецца ўлада самога Жыгімонта Старога. Даследчык М.А. Максімейка адзначае, што з канца 1522 г. і да красавіка 1528 г. Жыгімонт Стары наогул не з'яўляўся ў Вялікім княстве Літоўскім [11, с. 74]. А.Э. Гудавічус, напісаўшы самую лепшую гісторыю Вялікага княства, канстатуе, што Жыгімонт Стары нават кінуў займацца справамі ў ВКЛ [3, с 538]. Рэальна ў Вільні толькі Альбрэхт Гаштольд мог перашкодзіць Юрыю Іванавічу Ільінічу атрымаць грошы.

У 1519 г. Жыгімонт Стары дае ў заставу Альбрэхту Гаштольду багаты двор Утэну за 1000 коп. грошай [26, с. 740]. Але ў 1527 г., г.з. адразу пасля апісваемых намі падзей, Гаштольд з дазволу Вялікага князя пераарандуе, калі можна так сказаць, гэты двор Яну Абрамавічу. У прывілеі на арэнду двара Яну Абрамавічу сказана, што: "...доходы все ис того двора нашого, гумна, дякла, корчмы, и иныи поплатки вси..." на сваю карысць Ян Абрамавіч мог браць толькі тады, калі выплаціць таксама 1000 коп. грошай [28, с. 472]. Узнікае пытанне, калі Ян Абрамавіч атрымаў такую вялікую спадчыну, то чаму ў яго не было адразу заплаціць 1000 коп. грошай? І наогул, сітуацыя даволі заблытаная: ці справіўся б з такой складанай справай, як спагнанне падаткаў, дзевятнаццацігадовы юнак?

Спынімся крыху на самой манеце, залатым дукаце, вакол якога разгортваліся гэтыя падзеі. Да 1528 г. Польшча і Вялікае княства Літоўскае сваёй залатой манеты не мелі, за вельмі рэдкім выключэннем. Практычна ўсе залатыя манеты былі імпартнымі. У Вялікае княства залатыя манеты паступалі

галоўным чынам з Венгрыі, дзе распрацоўваліся багатыя радовішчы гэтага каштоўнага металу. У 1328 г. ў гарняцкім пасёлку Крэмніца быў адкрыты манетны двор, на якім пачалося біццё залатой манеты. Першапачаткова яна называлася флорын (ад назвы горада Фларэнцыя). Такіх флорынаў у год адбівалася да 500 тыс. Некалькі пазней першапачатковая манета відазмянілася і стала называцца дукатам. У Вялікім княстве Літоўскім мелі найбольшае хаджэнне дукаты, адбітыя пры каралю Мацвею Корвіне, які кіраваў Венгрыяй у 1458–1490 гг. (Іл.2) На аверсе манеты змяшчалася выява Святога Уладзіслава, заступніка рудакопаў. Справа ад выявы Святога Станіслава памяшчаўся знак манетнай майстэрні. Гэта маленькі шчыт з молатам і клінам – галоўнымі прыладамі рудакопаў. Ударам молата па кліне адбіваліся кавалкі пароды ў забоі. На рэверсе манеты змяшчалася выява герба Венгрыі. Маса дуката была 3,55 грама, проба – 988. Такім чынам, агульная вага 10 тыс. дукатаў – 35,5 кг золата.



**Дукат вугорскі Мацея Корвіна 1458–1490**

*Іл.2 Манеты Беларусі да 1707*

Наступныя два прыклады даюць уяўленне аб тым, наколькі вялікай была сумма ў 10 тыс. дукатаў. На Віленскім сойме 1522 г. было вырашана сабраць сярэбшчыну. Усе разам паны-рада здалі 960 дукатаў серабшчыны. Юрый Іванавіч Ільініч асабіста здаў 100 дукатаў. Некаторыя радныя паны здалі толькі па 30 дукатаў [10, с. 17]. У тыя гады за дыплом аб набыцці тытула графа Альбрэхт Гаштольд заплаціў 100 дукатаў [21, с. 135]. Вышэйпрыведзеныя даныя говораць пра тое, што сума ў 10 тыс. дукатаў была сапраўным багаццем.

Хацелася б таксама адзначыць той факт, што пасля заўчаснай смерці пры родах дачкі Ядвігі ў 1518 г., у касцёле Святога Станіслава была пахавана жонка Юрыя Іванавіча Ільініча [17, с. 37]. У 1526 г. побач з жонкаю быў пахаваны Юрый Іванавіч [8, с. 41]. Замак перайшоў да яго нашчадкаў.

Юрый Іванавіч Ільініч сваё багацце набыў на дзяржаўнай службе і калі валодаў вельмі даходнымі Брасцейскім і Ковенскім староствамі. Будучы пры двары, ён займаў “паркетную” пасаду надворнага маршалка, г.з. адказваў за прыдворны цырыманіял. Было нешта экстраардынарнае ў тым, што чалавек пад 60 гадоў мог узяцца за грандыёзнае па тым часе будаўніцтва ў Міры. І гэтым экстраардынарным сталі вялікія грошы, якія аказаліся ў руках Юрыя Ільініча. Памятаючы пра тое, як у яго забіралі пасаду Лідскага старасты, як яго груба выкінулі з Коўна, Юрый Іванавіч Ільініч вырашыў, і як мага хутчэй, грошы свае ўкласці ў нерухомасць.

Такім чынам, нельга звязваць будаўніцтва Мірскага замка толькі з вышэйадзначанымі 10 тыс. дукатаў. Адзінае, што звязвае гэтыя дзве падзеі – супадзенне па часе. Крыніцы фінансавання будаўніцтва Мірскага замка трэба шукаць у Коўне, Бярэсці і Лідзе. Менавіта там збіраў сваё багацце Ільініч, якое затым уклаў у Мірскі замак. Напэўна, жаданне матэрыялізаваць вялікую наяўнасць ад арэндаў у Коўне

і Бярэсці прывяло да будаўніцтва Мірскага замка. Гэта былі інвестыцыі ў будучыню. 10 тыс. дукатаў былі толькі дадаткам да гэтага капіталу.

**P.S.**

У 1569 г. уладаром Мірскага замка стаў кн. Мікалай Крыштоф Радзівіл, больш вядомы па мянушцы Сіротка. Першапачаткова функцыі рэзідэнцыі радзівілаўскіх латыфундый, як сцвярджае польскі даследчык Т. Бернатовіч, выконваў Мірскі замак [19, s. 10]. Цікавае пытанне, чаму ён пакінуў сваю рэзідэнцыю ў Мірскім замку і пачаў вельмі дарагую будоўлю ў Нясвіжы? Па памерах, па велічыні ў Беларусі не было нічога, што магло б параўнацца з Мірскім замкам.

Можна выказаць думку, што адбылося гэта з наступнай нагоды. Якраз у гэты час "каронны" канцлер Ян Замойскі ў Замосці спрабуе стварыць ўзорны горад [5, с. 111]. Магнаты Вялікага княства Літоўскага балюча ўспрымалі любыя поспехі свайго "сваяка", таму і тут вырашылі не адставаць. Маштабнае будаўніцтва развярнуў у толькі што набытым уладанні Заслаўе трокскі ваявода Ян Янавіч Глябовіч. Узводзіцца магутны Заслаўскі замак, на двары якога будуецца велічны кальвінскі збор і палац-рэзідэнцыя.

Сіротка не мог застацца ўбаку ад новай моды. Ён таксама вырашыў ні ў чым не саступаць свайму рэлігійнаму праціўніку (Сіротка быў каталікам, а Глябовіч пратэстантам). Але спыніцца на Міры ён не мог. Імя Ільініча нельга было аддзяліць ад замка. І Сіротка разумеў гэта. Таму ён вырашыў пачаць будаўніцтва ў Нясвіжы. А для Мірскага замка, які ў той час, хутчэй за ўсё, быў яшчэ недабудаваны, ён наняў брыгаду майстроў пад кіраўніцтвам Яна Каспровіча з Польшчы і даручыў яму завяршыць будаўніцтва (імя Яна Каспровіча як кіраўніка перабудовы Мірскага замка ў 80-я гг. XVI ст. пер-

шым назваў Мацей Сякерскі з Стэндфардскага ўніверсітэта ў Каліфорніі ў сваім артыкуле, змешчаным у часопісе “Acta Baltico-Slavika”) [25, s. 269].

## Літаратура і крыніцы


1. Бершадский, С.А. Литовские евреи. История их юридического и общественного положения в Литве от Витовта до Люблинской унии. 1388–1569 гг./ С.А. Бершадский. – СПб, 1883. – 431 с.

2. Бершадский, С.А. Авраам Езефович Ребичкович, подскарбий земский, член Рады Великого княжества Литовского/ С.А. Бершадский. – Киев, 1888. – 157 с.

3. Горбачевский, Н. И. Словарь древняго актоваго языка Северо-Западнаго края и царства Польскаго/ Никита Горбачевский. – Вильна, 1874. Репринт изд. München: Verlag. Otto Sagner. 1992. – 397 с.

4. Гудавичюс, Э. История Литвы: с древнейших времён до 1569 года/ Эдвардас Гудавичюс. – М.: Фонд им. И.Д. Сытина, 2005. – 679 с.

5. Дыбковская, А. История Польши с древнейших времён до наших дней. Научное издательство ПВН/ Алиция Дыбковская, Малгажата Жарын, Ян Жарын. – Варшава, 1995.

6. Калнін, В.В. Замак у г.п. Мір: архітэктурна-гістарычныя даследаванні. Т. 1. Перыяд (1395–1569). Мн. – 1992 г. (Архіў Нацыянальнага мастацкага музея Республики Беларусь. Ф. 164. Оп.3. Д.23.).

7. Калнін, В.В. Мірскі замак / Калнін В. – Мн.: Беларусь, 2002. – 160 с.: іл.

8. Калнін, В.В. Хто пабудаваў Мірскі замак // Мірскі замак як гісторыка-культурны феномен XV – пачатку XX стагоддзя. Новыя даследаванні: Навукова-практычная канферэнцыя/ В. Калнін. – Мн., 2004.

9. Литовская Метрика (1522–1530). 4-я книга судных дел. Издательство Вильнюсского Университета. – Вильнюс, 1997. – 664 с.

10. Любавский, М.К. Литовско-русский сейм. Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешней жизнью государства/ М.К. Любавский. – М., 1900. – 1160 с.

11. Максимейко, Н.А. Сеймы Литовско-Русского государства до Люблинской унии 1569 г./ Н.А. Максимейко. – Харьков, 1902. – 205 с.

12. Малиновский, М.Н. Сборник материалов, относящихся к истории панов-рады Великого Княжества Литовского/ М.Н. Малиновский. – Томск, 1901. – 508 с. Приложение CLX с.

13. Русско-еврейский архив. Документы и материалы для истории евреев в России в 3 томах. Т. 1. Документы и регестры к истории литовских евреев (1388–1550). – СПб., 1882. – 376 с.

14. Спиридонов, М.Ф. Заславль в XVI в. / М.Ф. Спиридонов. – Мн., 1998. – 95 с.

15. Статут Великого княжества Литовского 1529 года. – Мн., 1960. – 254 с.

16. Сыракомля, У. Добрыя весці: Паэзія, проза, крытыка / У. Сыракомля. – Мн.: Маст. літ., 1993. – 526 с.

17. Трифонова, Н.Я. Ильиничи – владельцы Мира // Мірскі замак і замкі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Праблемы музеефікацыі. Міжнародная навуковая канферэнцыя. – Мір, 2005.

18. Хроника Быховца. Издательство “Наука”. – М., 1966. – 154 с.

19. Bernatowicz, Tadeusz. Monumenta Variis Radivillorum. Wyposażenie zamku Nieświeskiego w świetie zródeł archiwalnych. Część I: XVI–XVII wieku/ Bernatowicz. – Poznań, 1998.

20. Kurczewski, Jan. Kościòł zamkowy czyli katedra Wileńska / Jan Kurczewski. – Wilno, 1910. – 325 s.
21. Kuźmińska, Marij. Olbracht Marcinowicz Gasztorłd // Ateneum Wileńskie. 1928, Z. 14–15.
22. Lietuwos Metrika = Lithuania Metrika = Metryka Litewska = Литовская Метрыка / Lietuvos istorijos institutos. – Vilnius: Mokslo enciklopediju leidykla, 1993. – kn. 6: (1494 – 1506). 2007. – 516 p.
23. Polski Słownik biograficzny. T. X. – Wrocław-Warszawa-Krakòw, 1962–1964. – 640 s.
24. Polski Słownik biograficzny. T. XIV. – Wrocław-Warszawa-Krakòw, 1962–1964.
25. Siekierski, Maciej. Landed Wealth in the Grand Duchy of Lithuania // Acta Baltico-Slavica. T. XXI. – Warszawa, 1992.
26. Słownik geograficzny królestwa Polskiego i innych krojow słowiańskich. T. 23. – Warszawa, 1892. – 960 s.
27. НГАБ, КМФ-18. Воп. 1. Адз. зах. 12.
28. НГАБ, КМФ-18, Воп.1. Адз. зах. 14, часткі 7–8.

## Дадатак

Листъ пану Яну Аврамовичу до вряду местского виленского выданье ему з ратуши сумы пенезей отца его, там положоное десяти тисечей золотых.

## Жигимонт

Листъ до войта местцу виленского и бурмистров и радцем бил намъ чолом дворанин наш пан Ян Аврамовичъ о томъ которыю десяти тысячых золотых под печатьми панов радъ наших у васъ на ратуши и казали есмо положити, котору юж суму тыіх золотых подъскарбый нашъ небожчикъ панъ Аврамъ сыну своему пану Яну отписалъ и быхмо ему дали,

ино мы видячи ижъ он вжо летъ своих доросъ, нехотячи тых пенезей болши того ховати, излаши нашое на его чоломъбитие то вчинили тую дісят тисечь золотых которыіи на ратуши у вас положоны суть ему есмо дали, и ачь колывекъ перъвосею писали есмо до вас абы вы тых пенезей никому недавали одно естли быхмо писали до вас в которому бы властная рука наша господарская уписана была тож бы есть на тотъ листъ нашъ тыіи тысячи выдали, какъ жо мы для того послали тамъ дворанина нашого Бориса Юрьевича с тымъ листом нашим в которомъ рука наша господарская вписана есть, и до воеводы теж виленского – пана Кгаштольда о том есмо писали абы его милосты к тому двораніну нашому которого чоловека доброго приставил, а так как скоро тот дворанин наш з листом нашим до вас на ратушъ приедеты приказуем вамъ ажъ бы есте тыіи золотыи десять тисячь всю сполна на перед тымъ дворанином нашимъ и вижомъ пана воеводинымъ пану Яну Аврамовичу выдали на тотъ листъ нашъ конечно и квит бы о.......те в ніго нато на нас к собе под печатью его взяли а тот листъ нашъ и квиту его все тое заховалі. Пісан в Кракове под лето народження 1526. Ноябрь 17. Инъдикъ 15.

В том листе рука королевская. Горностай писар.

Друкуецца з НГАБ, КМФ-18. Воп. 1. Адз. зах. 14, часткі 7–8, арк. 316.